**HARMATNY V.P. Periodization of the comasation on the lands of Western Belarus in 1921–1939**

The article tells about the periodization of comasation in Western Belarus in 1921–1939. The author shows suffering of local peasantry and necessity of the agrarian reform which was realized by Polish government in 1921–1939. Realization of comasation was accompanied by distribution of credits. Thanks to comasation in Western Belarus the quantity of working days necessary for peasants for the cultivation their lands decreased, quality of cultivation agriculture lands was improved and accordingly its crop capacity increased. In accordance with socio-economic circumstances and the pace of comasation its realization by Polish authorities on the territory of Western Belarus it is necessary to divide into three main periods: 1) 1921–1928; 2) 1929–1933; 3) 1934–1939.

УДК 341.322.6(476)(=432.1) «192»

***Грыбава С.У.***

# БЕЛАРУСКІЯ ТАТАРЫ Ў ГАДЫ ПАЛІТЫЧНЫХ РЭПРЭСІЙ 30-Х ГАДОЎ ХХ СТ. У БССР

Таталітарны сталінскі рэжым 30-х гадоў закрануў людзей з розных бакоў: перахлёсты ў рэлігійнай і нацыянальнай палітыцы, індустрыялізацыі і насаджэнні калгасаў, чысткі ў арміі і дзяржапараце. Пацярпела ад сталінскіх рэпрэсій у гэты перыяд і татарскае насельніцтва Беларусі.

Рэлігійная палітыка савецкай улады была накіравана супраць існавання розных канфесій, у тым ліку і мусульманскай. Антырэлігійная прапаганда на «сталінскай мове» азначала знішчэнне мячэцей і мулаў. У 1936 г. мячэць у Мінску была зачынена і перададзена пад склад харчовых тавараў. Годам раней былі знішчаны мячэці ў Смілавічах і Капылі, спалена мячэць ва Уздзе. Быў «раскулачаны» і высланы на поўнач са сваёй шматлікай сям'ёй і загінуў у выгнанні апошні мула Уздзенскай мячэці Мухамед Александровіч (у 1930 г.), расстраляны ў Чэрвеньскай турме мула Смілавіцкай мячэці Мустафа Хасяневіч, мязім (ці муэдзін, памочнік мулы) Адам Хасяневіч і былы мула гэтай мячэці Асан Паўтаржыцкі (у 1937 г.). Неабгрунтаваныя рэпрэсіі былі значнай часткай тагачаснай палітычнай дзейнасці партыйна-дзяржаўных органаў Беларусі. Яны былі накіраваны не толькі супраць рэлігійных дзеячаў.

Згодна з дакладам намесніка паўнамоцнага прадстаўніка АДПУ па Заходняму краю І. Апанскага, ва ўмовах НЭПа ўзрастала актыўнасць нацыянальнай інтэлігенцыі, прадстаўнікоў нацыянальных груп, дзейнасць якіх негатыўна ўспрымалася ўладамі [1, с. 83]. Так, падчас фарсіраваных сацыяльных пераўтварэнняў у 30-я гг. шырока праводзілася барацьба супраць так званага нацыянальнага адзінства, якая закранула разам з іншымі нацыянальнасцямі і татараў. Дарэчы, першым прадстаўніком цюркска-мусульманскіх народаў, абвінавачаным у нацыяналізме, панцюркізме і панісламізме, быў вядомы татарскі дзеяч Султан-Галіеў. Яму таксама прыпісвалася стварэнне і кіраўніцтва падпольнай антысавецкай арганізацыяй у рэгіёне Ідэль-Урала. «Справа Султан-Галіева» была сфабрыкавана органамі ДПУ ў 1923 г.

Закранулі пазначаныя працэсы і беларускіх татараў. У Мінску ў сакавіку 1933 г. органамі АДПУ была арыштавана група татарскіх і беларускіх інтэлігентаў, якія абвінавачваліся па сумнавядомым артыкулам 72 і 76 Крымінальнага кодэксу БССР (антысавецкая агітацыя і прапаганда, удзел у контррэвалюцыйных органах). У сфабрыкаваным абвінаваўчым заключэнні па справе І.К. Гембіцкага., І.Х. Мурза-Мурзіча, І.Х. Рызвановіча і І.Х. Дашкевіча гаварылася, што *«у сакавіку 1933 г. была ліквідавана контррэвалюцыйная нацыяналістычная татарская групоўка, якой кіраваў былы падпалкоўнік царской арміі Гембіцкі Іван Канстанцінавіч* (Ях'я Хасенавіч Гембіцкі – вядомы грамадскі дзеяч, гісторык, які шмат намаганняў паклаў дзеля нацыянальна-культурнага развіцця татарскай меншасці ў міжваенны перыяд – *С.Г.*). *У склад групоўкі ўваходзілі Мурза-Мурзіч Ібрагім Халільевіч, Рызвановіч Хасень Іосіфавіч, Дашкевіч Іосіф Сямёнавіч, Даўгяла Дзмітрый Іванавіч, Мухля Ібрагім Александравіч. Контррэвалюцыйная татарская групоўка развівала арганізацыйную дзейнасць па стварэнню контррэвалюцыйнай арганізацыі за кошт татарского рэлігійнага насельнщтва, варожа настроенага супраць Савецкай улады, распаўсюджваючы свой уплыў і на працоўных татараў для стварэння контр-рэвалюцыйнай нацыяналістычнай арганізацыі, якая ставіла сваёй мэтай звяржэнне Савецкай улады і ўстанаўленне рэспубліканска-дэмакратычнага ладу»* [2, с. 214]. І.К. Гембіцкі, І.Х. Мурза-Мурзіч, Х.І. Рызвановіч, І.С. Дашкевіч былі асуджаны на тры гады высылкі ў Казахстан. Па просьбе Беларускага грамадскага аб'яднання татараў «Зікр уль-Кітаб» кіраўніцтва Дзяржкамархіва Беларусі звярталася ў сакавіку 1998 г. у Інфармацыйны цэнтр Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Казахстан з запытам аб прадстаўленні звестак на Я. Гембіцкага, І. Мурза-Мурзіча і Х. Рызвановіча. 28 красавіка 1998 г. Упраўленне крымінальнай інфармацыі выслала даведку на Ях'ю Гембіцкага, з якой відаць, што пасля высылкі ў Казахстан ён працаваў эканамістам у абласным упраўленні калгасаў г. Уральска. 14 ліпеня 1938 г. Я. Гембіцкі быў паўторна арыштаваны і знаходзіўся ва Уральскай турме. На І. Мурза-Мурзіча і Х. Рызвановіча звестак няма. Там жа, у Казахстане, яны былі паўторна асуджаны да вышэйшай меры пакарання. 10 кастрычніка 1989 г. рашэннем Пракуратуры БССР І.К. Гембіцкі, І.Х. Мурза-Мурзіч, Х.І. Рызвановіч, І.С. Дашкевіч былі рэабілітаваны пасмяротна [2, с. 230].

У 1937–1938 гг. па загаду з Масквы праводзілася аперацыя па ліквідацыі польскай, нямецкай і латвійскай агентуры. Цэнтр лічыў, што БССР з'яўлялася плацдармам для пранікнення варожай, асабліва польскай «агентуры» ў іншыя рэгіёны СССР. У жніўні 1938 г. паводле загаду М.І. Яжова падлягалі арышту не менш як 7–8 тысяч польскіх «шпіёнаў» – былых удзельнікаў польскіх узброеных фарміраванняў, палітэмігрантаў, членаў нелегальнай «Польскай арганізацыі вайсковай» (ПАВ) і інш. У выніку здзейсненай працы з дакументамі ў архіве КДБ вядомы даследчык гісторыі татарскай меншасці Беларусі І.Б. Канапацкі прыводзіць наступныя дадзеныя аб рэпрэсаваных з ліку татарскага насельніцтва БССР. Адразу па трох артыкулах: 68, 71, 76 Крымінальнага кодэксу БССР (шпіянаж, дыверсія, удзел у контррэвалюцыйных арганізацыях) было прад'яўлена абвінавачванне бухгалтару арцелі Белпрамсавета Байрашэўскаму Аляксандру Мустафавічу, 1890 года нараджэння, служачаму, выхадцу з дваран, былому члену КП(б)Б, які пражываў у г. Мінску. Ён быў расстраляны 26 снежня 1937 г. Брат А.М. Байрашэўскага Ібрагім Мустафавіч Байрашэўскі таксама быў арыштаваны НКУС 22 жніўня 1937 г. У ходзе следства Ібрагім Байрашэўскі спачатку абвінавачваўся ў шпіянажы, а затым, калі шпіянаж не пацвердзіўся, – у антысавецкай агітацыі. Вінаватым сябе ў прад'яўленых яму абвінавачваннях Ібрагім Байрашэўскі не прызнаў. Тым не менш, пастановай НКУС СССР і Пракуратурай СССР ад 28 верасня 1937 г. ён быў асуджаны на 10 гадоў папраўча-працоўных лагероў. Памёр 16 красавіка 1943 г. ва Ухціжэмлагу (Комі АССР). У 1956 г. у выніку дадатковага расследавання было высветлена, што звестак аб прыналежнасці братоў Байрашэўскіх да агентуры польскіх

***Грибова Светлана Владимировна**, ст. преподаватель кафедры социально-политических и исторических наук Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*



Репозиторий БрГТУ

разведорганаў няма. Справа была спынена за-за адсутнасці састава злачынства. 5 чэрвеня быў арыштаваны і 21 верасня 1938 г. асуджаны да вышэйшай меры пакарання як агент германскай і польскай разведак бухгалтар Цеплацэнтралі Міхась Іосіфавіч Рызвановіч. Растраляны 25 верасня 1938 г. Рэабілітаваны 30 красавіка 1989 г. Пракуратурай БВА. 11 чэрвеня быў арыштаваны і асуджаны да вышэйшай меры пакарання 25 верасня 1938 г. як польскі шпіён татарын з дваран, сын мулы, галоўны бухгалтар Народнага камісарыята земляробства Смайкевіч Сулейман Мустафавіч. Ён быў растраляны ў Мінску 29 верасня 1938 г. Рэабілітаваны 10 жніўня 1959 г. Ваенным Трыбуналам БВА. Летам 1938 г. былі арыштаваны і асуджаны як агенты польскай разведкі да расстрэлу браты Адам і Браніслаў Гімбіцкія, якія паходзілі з хутара Пятрова Докшыцкага раёна, Віцебскай вобласці, жылі і працавалі ў м. Докшыцы. Адам працаваў нарыхтоўшчыкам Бягомльскага аддзялення «Саюзкож», а Браніслаў – грузчыкам Райсаюза. Расстраляны 26 лістапада 1938 г. Рэабілітаваны ваенным трыбуналам адпаведна 21 снежня 1960 г. і 18 студзеня 1961 г. 26 ліпеня быў арыштаваны, асуджаны 1 лістапада 1938 г. да расстрэлу былы палкоўнік царскай арміі Асман Бекіравіч Смольскі за тое, што праводзіў шпіёнскую контррэвалюцыйную працу на тэрыторыі Савецкага Саюза на карысць Польшчы. У віну Асману Бекіравічу Смольскаму была пастаўлена служба ў арміі Урангеля.

Трагічна склаўся лес і генерала з беларускіх татараў, камандзіра дывізіі, Іскандэра Іскандэравіча (Аляксандра Аляксандравіча) Талькоўскага. І.І. Талькоўскі быў удзельнікам 1-й сусветнай вайны. У 1917–1918 гг. – камандзір мусульманскага палка 1-й Петраградскай стралковай дэвізіі. У 1919–1931 гг. у Казані, начальнік стралковай часці 2-х мусульманскіх камандных курсаў, начальнік штаба, камандзір 1-й Асобай Прыволжскай татарскай стралковай брыгады. З 1923 г. – начальнік і камісар аб'яднанай Татара-Башкірскай ваеннай школы, з 1931 г. – камандзір і ваенкам 3-й стралковай Крымскай дэвізіі. У 1938 г. ён быў арыштаваны, але 16 мая 1940 г. судовая справа па абвінавачванню Талькоўскага ваеннай пракуратурай акругі была спынена. Аднак 30 чэрвеня 1941 г. яго ў другі раз арыштавалі. 11 лютага 1942 г. было канчаткова сфармулявана абвінавачванне, па якому былы камандзір 3-й Крымскай стралковай дэвізіі абвінавачваўся ва ўдзеле «у антысавецкай ваеннай змове і рабоце на германскую разведку» [3. с. 119]. На асабовай нарадзе пры НКУС СССР 13 лютага 1942 г. І. Талькоўскі быў прысуджаны да смяротнага пакарання. Яго расстралялі 23 лютага 1942 г. Вярхоўны суд СССР 26 красавіка 1956 г. паставіў пытанне «аб спыненні справы ў адносінах І. Талькоўскага за адсутнасцю састава злачынства і аб адмене пастановы ад 13 лютага 1942 г.» [3, с. 117].

Палітычныя рэпрэсіі 30-х гг. закранулі амаль кожную татарскую сям'ю, прынеслі нешматлікаму татарскаму народу велізарныя страты.

Рэпрэсіі працягваліся і ў наступныя гады. І хаця найбольшая іх хваля прыйшлася на 1936–1938 гг., тым не менш і пазней ніхто не мог быць гарантаваны ад абвінавачванняў і маючых адбыцца з-за гэтага наступстваў. Асабліва гэта датычылася насельніцтва тых рэгіёнаў, што былі ўключаны ў склад СССР у 1939–1940 гг. – Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, Прыбалтыкі, Бесарабіі і Паўночнай Букавіны. Савецкія ўлады вырашылі ачысціць гэтыя тэрыторыі ад так званых «сацыяльна небяспечных элементаў», «ворагаў народа» і «недобранадзейных». У Заходняй Беларусі да іх адносілі былых прадпрымальнікаў і заможных землеўладальнікаў, службоўцаў польскага дзяржаўнага апарата, вайскоўцаў і супрацоўнікаў сілавых структур, палітычных дзеячаў міжваеннай Польшчы, духоўных асобаў розных канфесій. Не маглі не закрануць гэтыя працэсы і татарскае насельніцтва, якое пражывала на далучаных да БССР землях.

У 1940 г. быў арыштаваны Альгерд Найман-Мірза Крычынскі, адзін з самых уплывовых і вядомых татарскіх палітычных і грамадскіх дзеячаў. У 1919 г. ён займаў пасаду міністра крымскага ўраду, у 1920 г. – віцэміністра азербайджанскага ўраду. З 1920 г. па 1938 г. ён быў старшынёй Цэнтральнай Рады Культурна-асветніцкага саюза татараў ІІ Рэчы Паспалітай. Альгерд Крычынскі таксама займаў высокія пасады ў судовай сістэме Польшчы. З 1925 г. ён выконваў функцыі віцэпракурора Акруговага суда ў Вільні, пазней пракурора Вышэйшага суда ў Варшаве (1933–1938 гг.). Апошні год перад вайной з верасня 1938 г. па верасень 1939 г. ён працаваў у Вільні віцэстаршынёй Апеляцыйнага суда. Альгерд Крычынскі быў арыштаваны пасля ўсталявання савецкай улады на Літве. Па паказаннях іншых арыштантаў, у чэрвені 1941 г. ён быў сасланы ў глыб Расіі. Памёр пры нявысветленых акалічнасцях. Апошні раз яго бачылі ў 1942 г. у Маскве на Лубянцы [4, с. 143].

Не абмінулі сталінскія рэпрэсіі і ўраджэнца Ляхавіч суч. Брэсцкай вобласці Алі Самуілавіча Вараговіча, імама Варшаўскай гміны, капеляна 1-га татарскага эскадрона 13 палка віленскіх уланаў. Адукацыю ён атрымліваў спачатку ў Вільні, у якасці вольнага слухача Віленскага універсітэта (1922–1926 гг.), потым навучаўся ў Львоўскім універсітэце Імя Яна Казіміра на аддзяленні ўсходніх моў, які закончыў у 1932 годзе. У 1928 годзе ён адбыў воінскую павіннасць і атрымаў чын падхарунжага капрала артылерыі. У лютым 1933 г. пачаў працаваць у Вільні ва ўтвораным муфціяце Рэчы Паспалітай, складаў каталог кніг і старажытных татарскіх рукапісаў. Атрымаўшы стыпендыю інстытута ўсходазнаўства ў Варшаве, ен працягваў сваю рэлігійную адукацыю ў Каірскім тэалагічным універсітэце «Аль-Азгар» (1933–1936 гг.). У студзені 1937 г. быў адзінадушна абраны імамам мусульманскай абшчыны Варшавы. Адначасова выконваў абавязкі капеляна 1-га татарскага эскадрона ў 13-м палку віленскіх уланаў і члена Найвышэйшай калегіі Мусульманскага рэлігійнага Саюза Рэчы Паспалітай. Супрацоўнічаў таксама з рэдакцыяй «Штогодніка татарскага» (з 1933 г.), напісаў шэраг артыкулаў. Пісаў таксама артыкулы ў часопісы «Жыццё татарскае» і «Ісламскі агляд». Увосені 1939 г. падрыхтаваў доктарскую дысертацыю, абарона якой была запланавана на лістапад 1939 г. У верасні 1939 г. А. Вараговіч з сям'ёй прыехаў да родных сваёй жонкі ў Клецк, дзе прыйшлося застацца з-за складанасці сітуацыі ў сувязі з падзеямі ІІ сусветнай вайны. Дарэчы, у Дзяржаўным архіве Мінскай вобласці захавалася заява Вараговіч Евы – жонкі Алі Вараговіча на атрыманне пашпарту, дзе пазначана дата прыбыцця ў Клецк: 9 верасня 1939 г., у якасці хатняга адрасу згадана ІІ Татарская вуліца, д. 24 [5]. Пасля таго як Клецк і ўся Заходняя Беларусь была заняты Чырвонай Арміяй, А. Вараговіч пачаў працаваць ў няпоўнай сярэдняй школе, быў намеснікам дырэктара. У 1941 г. НКУС звярнуў увагу на яго міжваенную дзейнасць. 20 студзеня 1941 г. у поўнач да яго прыйшлі з вобыскам. Вараговіч быў абвінавачаны ў шпіянажы ў сувязі з яго вучобай у Каіры, нягледзячы на тое, што там ён займаўся выключна навуковай дзейнасцю. Яго дыпломы і дакументы былі забраны, як рэчавыя доказы яго сувязі з замежнымі краінамі [6, с. 11–12]. Дарэчы, у 1991 г. Камітэт Дзяржаўнай бяспекі ў адказе на запрос аб звестках, якія захоўваюцца ў архіве КДБ аб А. Вараговічы, даў наступную інфармацыю: «В ходе проверки архивных материалов в отношении Али Самуиловича Вороновича установлено, что он был арестован органами НКВД 20 января 1941 г. по подозрению в принадлежности к контрреволюционной организации «Идель-Урал», которая существовала в Польше…» [7, с. 32]. А. Вараговіч быў арыштаваны і адпраўлены ў турму ў Баранавічах, потым вясной 1941 г., у сувязі з павышаным да яго інтарэсам органаў НКУС, ён быў пераведзены ва ўнутраную турму НКУС г. Мінска, дзе знаходзіўся да красавіка 1941 г., а прыблізна 25 чэрвеня разам з тысячамі вязняў мінскіх турмаў быў этапіраваны калонай на ўсход [4, с. 245]. Па найбольш верагоднай версіі, выказанай жонкай А. Вараговіча – Евай, якая грунтуецца на шэрагу пасляваенных замежных публікацыях, Алі Вараговіч трагічна загінуў 24–27 чэрвеня 1941 г. на маршы Мінск-Чэрвень або ў самім горадзе Чэрвені пры эвакуацыі вялікай колькасці вязняў з турмаў г. Мінска на ўсход. Сімвалічная магіла Алі Вараговіча, абсталяваная яго жонкай Евай, знаходзіцца на татарскім мізары ў Варшаве. У пасляваенныя гады, пасля паўторнай праверкі органамі КДБ БССР, Алі Вараговіч быў цалкам рэабілітаваны за адсутнасцю састава злачынства [8, с. 68].

Не абмінулі рэпрэсіі і татараў з іншых месцаў іх пражывання. Быў дэпартаваны з сям'ёй у Архангельскую вобласць былы асаднік з Нясвіжскага раёна Баранавіцкай вобласці Смайкевіч Рамуальд

Repository BrSTU

(Рамазан) 1891 года нараджэння [9, с. 460]. Потым ён трапіў у армію Уладыслава Андэрса, якая пачала фарміравацца ў верасні 1941 г. на тэрыторыі СССР з польскіх палонных салдат, бежанцаў, былых польскіх асаднікаў. Казакевіч Ян з в. Іванава Нясвіжскага раёна быў арыштаваны за антысавецкія погляды па даносу 10 снежня 1939 г., асуджаны і вывезены на працу ў Архангельскую вобласць. Падчас вайны амнісціраваны і перавезены ў Казахстан. Пасля вызвалення Беларусі, нягледзячы на просьбы родных, не быў адпушчаны да дому, а паўторна асуджаны і адпраўлены ў лагер, дзе ён знаходзіўся да 1955 г. [10, с. 3]. У лагерах Архангельскай вобласці таксама адбывалі пакаранне і навагрудскія татары: Смольскі Ібрагім Адамавіч (1902 г.н.), Сафарэвіч Бякір Мустафавіч (1912 г.н.), асуджаныя ў верасні 1940 г. Татары са Скідзеля, браты Мількамановічы: Стэфан (1903 г.н.) і Раман (1915 г.н.) Самуілавічы былі арыштаваны ў 1940 г. і накіраваны ў лагера Варкуцінскай вобласці [11].

Закранулі рэпрэсіі грамадскіх і ваенных дзеячаў з ліку татараў у Слоніме. Маёр Давід Яновіч-Чаінскі быў адным з арганізатараў Татарскага Палка Уланаў ім. Мустафы Ахматовіча (1920 г.), што садзейнічала адраджэнню вайсковай традыцыі татараў. З 1922 г. пэўны час ён служыў у 3 стралецкім конным палку (3 Pułk Strzelców Konnych im. Hetmana Polnego Koronnego Stefana Czarnieckiego - oddział kawalerii Wojska Polskiego II RP.), які размяшчаўся ў Валкавыску. Кожнае лета полк праходзіў вучэнні ў ваколіцах Слоніма і па ініцыятыве Давіда Яновіча-Чаінскага, як афіцэры так і салдаты былі расквартэраваны ў Слоніме на вул. Татарскай. Жыхары горада прадстаўлялі ім месца ў сваіх памяшканнях і стайні для коней. Кожны дзень палкавы аркестр даваў канцэрты на гэтай вуліцы. Пасля выхаду на адпачынак Давід Яновіч-Чаінскі займаўся грамадскімі справамі. Перад Другой сусветнай вайной ён быў арыштаваны НКУС і згінуў у савецкіх засценках [12, с. 235]. Яго родныя, як сям'я польскага асадніка, былі дэпартаваны на пасяленне 10 лютага 1940 г. у Валагодскую вобласць [13, с. 205]. Слонімскі татарын палкоўнік Мацей Байрашэўскі (1868 г.н.) таксама ўдзельнічаў у стварэнні Татарскага Палка. Шмат часу ён прысвячаў грамадскай дзейнасці на карысць татарскай суполцы. Пісаў артыкулы ў часопіс «Жыццё татарскае», дзе асвячаў невядомыя эпізоды гісторыі татараў [12, с. 235]. Ён быў арыштаваны НКУС як польскі асаднік, і загінуў 5 студзеня 1941 г. Яго сям'я у складзе жонкі Байрашэўскай Зехры і пяцёра дзяцей у 1940 г. былі дэпартаваны на пасяленне ў Валагодскую вобласць. Адзін з яго сыноў, Амар, быў абвінавачаны НКУС у антысавецкай агітацыі і адбываў у лагеры пакаранне 5 гадоў да 14 чэрвеня 1945 г. Пасля вайны некаторыя члены сям'і Байрашэўскіх пэўны час жылі на Украіне, потым вярнуліся ў Польшчу. Джанура, дачка Мацея і Зехры Байрашэўскіх, трапіла ў Армію У. Андэрса, у складзе якой выйшла з тэрыторыі СССР. Пасля вайны апынулася ў Англіі [14]. Трэба адзначыць, што ў Слонімскай татарскай абшчыне за 1939–1940 гг. было арыштавана 24 чалавекі [15, с. 215].

Не пазбегнулі лёсу польскіх ваеннаслужачых і татары, якія служылі ў 13-м палку віленскіх уланаў у складзе Войска Польскага. Клецкі татарын Абрамовіч Мустафа Ібрагімавіч (1916 г.н.) нёс службу з 1937 г. Пасля нападу нямецкіх войскаў на Польшчу і разгрома Войска Польскага, ён трапіў у савецкі палон. Працаваў у шахтах Крывога рога. Летам 1940 г. ён быў накіраваны ў Львоўскую вобласць на будаўніцтва дарог і аэрадромаў. У 1941 г. пераведзены на Усход у лагер для ваеннапалонных у Старабельску ў Харкаўскай вобласці. Адкуль трапіў у армію Уладыслава Андэрса [16, с. 2–3]. Пэўны час знаходзіўся ў лагеры для ваеннапалонных у Асташкове, што пад Масквой, і клецкі татарын Якуб Казакевіч (1914 г.н.), які таксама служыў ў складзе 1 татарскага эскадрона 13-га палка віленскіх уланаў, які ў канцы верасня 1939 г. быў разгромлены нямецкімі войскамі [17, с.127]. Былі татары і сярод польскіх афіцэраў, расстраляных у Катыні савецкімі ўладамі [18].

Увогуле ў выніку здзейсненага намі навуковага пошуку на падставе дадзеных Цэнтра «Карта» ў Варшаве, які займаецца зборам інфармацыі аб рэпрэсаваных савецкімі ўладамі польскіх грамадзянах, налічваецца каля 35 чалавек з ліку татарскага насельніцтва з заходніх рэгіёнаў Беларусі, дэпартаваных і арыштаваных у 1939–1941 гг. [11]. Акрамя таго, улічваючы дадзеныя, якімі мы валодаем яшчэ аб 15 чалавеках, агульная лічба рэпрэсаваных татараў складае каля 1 % ад татарскай дыяспары Заходняй Беларусі і каля 0,03 % ад усіх рэпрэсаваных (каля 160 тысяч чалавек) з заходніх абласцей Беларусі за вызначаны перыяд [15, с. 215; 19, с. 271; 20].

Паводле дадзеных старшыні Камітэта па архівах і справаводству Рэспублікі Беларусь У. Адамушкі, зробленых аўтарам на падставе апрацоўкі 40 300 картак персанальнага ўліку на жыхароў Мінска, Мінскай і Віцебскай абласцей, якія былі рэпрэсаваны судовымі і несудовымі органамі ў 20–50-я гг. і рэабілітаваны ў 1955–1994 гг., 49 чалавек былі татарамі (0,12 % ад усёй колькасці рэпрэсаваных). Але У. Адамушка паведамляе, што вывучаныя ім 40 300 людскіх лёсаў складаюць толькі 6,5 % ад ацэначнай лічбы ўсіх ахвяр рэпрэсій 20–50-х гг. у Беларусі.

Такім чынам, жыццё татарскай меншасці ў БССР адбывалася ў напрамку тых палітыка-грамадскіх змен, якія мелі месца ў краіне. Не выключэннем стала і рэпрэсійная палітыка савецкіх улад, якая закранула і беларускіх татараў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Пушкін, І.А. Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці. 20-я гг. ХХ ст.: дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / І.А Пушкін.– Мінск, 2002. – 117 л.
2. Канапацкі, І.Б. Ях'я Гембіцкі – лідэр адраджэння беларускіх татараў (да 120-й гадавіны з дня нараджэння) / І.Б. Канапацкі // Bialoruskie zeszyty historyczne. – 2005. – № 23. – S. 213–230.
3. Гришин, Я. Шарафутдинов Д. Отчизны верные сыны.О военачальниках – выходцах из древних татарских родов / Я. Гришин, Д. Шарафутдинов. – Казань, 2001. – 130 с.
4. Tyszkiewicz, J. Z historii tatarow polskich 1794–1944 / J. Tyszkiewicz. – Pultusk, 1998. – 176 s.
5. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ). Фонд – 1539. – Воп. – 1, Спр. – 5. – л. 27.
6. Tyszkiewicz, J. Imam Ali Ismail Woronowicz w Warszawie i Klecku: 1937-1941 / J. Tyszkiewicz. // Rocznik tatarow polskich. – 1995. – T. III. – S. 8–20.
7. Александрович, Х.М. Слово об Али Вороновиче / Х.М. Александрович // Байрам. – 1998. – № 4. – С. 30–35.
8. Канапацкі, І.Б. Да пытання ўдзелу мусульман у барацьбе беларускага народа супраць фашысцкіх захопнікаў у гады Другой сусветнай вайны / І.Б. Канапацкі // Вызваленне Беларусі ад германскіх акупантаў (восень 1943 – лета 1944 гг.) : матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 29 крас. 2004 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2004 – С. 99–105.
9. Польские спецпереселенцы в Архангельской области / Информационный центр Управления внутренних дел Вологодской области, Вологда, Научно-информационный и просветительский центр «Мемориал», Москва, Центр КАРТА, Варшава; сост. Э. Рыбарска, А. Гурьянов. – Варшава: Центр КАРТА, 2004. – 490 с.
10. Александрович, Х.М. Татары в книгах «Память» районов их проживания / Х.М. Александрович // Жизнь, Жыццё татарскае. – 2002. – № 4. – С. 3–4.
11. Baza elektroniczna Fundacji Osrodka KARTA, Indeks Represjonowanych, Warszawa
12. Miskiewicz, A. O tatarach polskich w Slonimie / A. Miskiewicz // Rocznik tatarow Polskich. – 1994. – № 2. – S. 231–236.
13. Польские спецпереселенцы в Вологодской области / Информационный центр Управления внутренних дел Вологодской области, Вологда, Научно-информационный и просветительский центр «Мемориал» Москва, Центр КАРТА, Варшава; сост. А. Дзенкевич. – Варшава: Центр КАРТА, 2005. – 510 с.
14. Archiwum Fundacji Osrodka KARTA, Indeks Represjonowanych w Warszawe. (Опросные листы, заполненные репрессированными лицами или членами их семей. IR-10262).
15. Канфесіі на Беларусі / В.В. Грыгор'ева [і інш.]; навук. рэд. У.І. Навіцкі. – Мінск: ВП «Экаперспектыва», 1998. – 340 с.


Репозиторий БрГТУ

16. Александрович, Х.М. Татары в книгах «Памяць» районов их проживания / Х.М. Александрович // Жизнь, Жыццё татарскае. – 2003. – № 5. – С. 2–3.
17. Александрович, Х.М. Татары клецкого джамията в годы Второй мировой войны / Х.М. Александрович // Участие тюркских народов и народов Кавказа в Великой Отечественной войне 1941–1945 гг.: материалы X Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 2–3 сент. 2004 г. / Белорус. гос. пед. ун-т; редкол.: И.Б. Канапацкий [и др.]. – Минск, 2004. – С. 124–149.
18. Miskiewicz, A. Polegli za Polske. O Tatarach polskich zamordowanych I zaginionych podczas Drugej wojny swiatowej / A. Miskiewicz // Nasz Dzennik. – 2002. – 2–3 listop. – S. 4–5.
19. Ruchniewicz, M. Stosunki narodowosciowe w latach 1939–1948 na obszarze tzw. Zachodnej Bialorusi / M. Ruchniewicz // Przemiany narodowosciowe na kresach wzchodnich II Rzeczypospolitej: zb. artyk.; pod red. S. Ciesielskiego. – Torun: wydawnictwo Adam Marszalek, 2003. – S. 242–322.
20. Асабісты архіў імама Слонімскай абшчыны Байрашэўскага С.М.


*Материал поступил в редакцию 17.05.12*

**GRIBIVA S.V. The Belarusian Tatars during political repressions of the 30th years of the XX century in BSSR**

The article is devoted to the repression politics pursued by the soviet authorities in the 30th of the XX century towards Tatar population in BSSR. The author provides information about charges of anti-Soviet activity and punishment of outstanding public and military activists belonging to Tatar community such as Ali Voronovich, Algerd Naiman-Mirza Ktichinski, Iskander Talkovski, David Janovich – Chainski. The author also refers to her scientific research and offers the statistics of how many Tatars in Minsk, Minsk region and Vitebsk region were repressed in Western Belarus in 1939 – 1941 as well as in 20th-50th of the XX century and later rehabilitated. The author notes that the life of Tatar minorities in BSSR was influenced by those political and social changes that took place in the country and the politics of repression by soviet authorities was one of them.

УДК 32.019.52

***Данилов Ю.Д.***

# ТЕОРЕТИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ИССЛЕДОВАНИЯ ПОЛИТИЧЕСКОГО СПЕКТРА

Исследование политических предпочтений является одним из важнейших направлений политологического анализа и реализации прогностической функции политологии, как таковой. Предметом изучения в данной области исследований выступает политический спектр общества в его динамическом отражении. В большинстве современных исследований политический спектр представляется как определенный способ моделирования различных политических позиций агентов политики, путём расположения их на одной или нескольких плоскостях политической реальности, которые образуются при наличии некоторых общих признаков.

Основоположником методологии политического моделирования по праву считают Л.Ф. Ричардсона, который в 1919 году опубликовал работу, в которой, изучая гонку вооружений в Англии и Германии накануне Первой мировой войны, провел параллель между физико-географическими и политическими явлениями. Выводы, полученные в ходе рассуждений по данной проблеме, привели ученого к мысли о возможности моделирования некоторых политических процессов по аналогии с физическими.

Такое направление получило дальнейшее развитие в труде С.А. Райса «Количественные методы в политической науке», который увидел свет в 1928 году. В этой работе были заложены основы математического моделирования в политологии, которое наибольшее развитие получило в 50-е – 60-е годы XX века.

В этот период в классификации политических предпочтений наибольшее место занимает исследование наиболее широкого спектра политических предпочтений, который традиционно включает в себя «правое крыло» и «левое крыло», пользуясь категориями, пришедшими в политологический научный лексикон из времен Великой французской буржуазной революции. Кроме того, Райсом было введено понятие «политическая ось», затем трансформированное в ряд идентичных дефиниций – «политическая плоскость», «политическое крыло» и т.д. Последователи Райса на простейшей оси «право – лево» помещают коммунизм, анархизм и экологизм обычно на краю слева, социализм (социал-демократия) – слева от центра, либерализм – в центре, консерватизм – справа от центра, а национализм и фашизм – на крайнем правом фланге.

Однако позднее было достаточно веско доказано, что простая ось «лево – право» не всегда достоверна при описании существующих различий в политических убеждениях, и поэтому была высказана идея о многоосном подходе к анализу политического спектра. Так родилась двухосная модель, в которой одна ось представляет культурные аспекты, а другая - политические. Каждая из осей имеет два полюса: индивидуализм и коллективизм. В то время как левых относят к индивидуалистам по общественным и культурным вопросам, и к коллективистам по отношению к экономическим вопросам, правые коллективисты в вопросах культуры и общественной жизни и индивидуалисты в вопросах экономики [3, 25].




В 1950 году Леонард Фергюсон провёл анализ политических ценностей, используя шкалы, измеряющие отношение населения к таким факторам, как:

- контролю рождаемости;
- смертной казни;
- цензуре;
- коммунизму, как идеологии и практике общественного развития;
- закону;
- патриотизму;
- вере;
- содержанию заключённых;

***Данилов Юрий Дмитриевич,** доцент кафедры социально-политичнских и исторических наук Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*



Репозиторий БрГТУ